*І.Ю.СЕРВАЧЫНСКІ*

# БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ САМАПОМАЧ
## (з гісторыі калабарацыянізма на Беларусі)

Гаворачы аб праблеме калабарацыянізму, нельга ўзгадаць аб Беларускай Народнай Самапомачы (БНС) – першай арганізацыі такога роду на Беларусі – ў перыяд акупацыі (1941–1944).

Афіцыйна яна была створана 22 кастрычніка 1941 г., што пацвярджае зварот генеральнага камісара Беларусі гаўляйтара Вільгельма Кубэ да беларускага народа, у якім абвяшчалася аб стварэнні БНС. У абнародаваным статуце БНС гаварылася, што яна "мае мэту ліквідаваць бяду – бярэмя, выкліканае польскім і камуністычна-жыдоўскім уладарствам, і стварыць беларускаму народу магчымасць лепшага культурнага развіцця".[1] У кампетэнцыю БНС уваходзілі пытанні аховы здароўя і сацыяльнай апекі; яна мела права ствараць інтэрнаты, дзіцячыя сады, клубы, дамы культуры, адкрываць свае прадпрыемствы, займацца выдавецкай дзейнасцю, арганізоўваць лекцыі, канцэрты, тэатральныя пастаноўкі, ствараць свае філіялы ва ўсіх гарадах і населеных пунктах Беларусі. Бюджэт БНС складаўся з членскіх узносаў (уступныя – 30 пфенінгаў), ахвяраванняў, прыбыткаў ад прадпрыемстваў, збораў з лекцый, тэатральных пастановак і інш. Да БНС перайшла ўся маёмасць, памяшканні, супрацоўнікі Беларускага Чырвонага Крыжа, які быў створаны ў ліпені 1941г., а затым ліквідаваны.

БНС мела наступную структуру: Цэнтральная Рада, акруговыя, раённыя, валасныя аддзелы. Старшынёй Самапомачы па распараджэнню рэйхсміністра акупіраваных усходніх абласцей А.Розенберга быў прызначаны Іван Ермачэнка, упэўнены прыхільнік супрацоўніцтва з Германіяй, які да вайны ўзначальваў Беларускі камітэт у Празе.

Кіраўніцтва БНС дамагалася ад нямецкіх улад змены адносін да беларусаў, прасіла даць ім магчымасць будаваць сваю джяржаўнасць і сваё войска. Немцы ніякіх абяцанняў не давалі. Гітлераўская вярхушка не збіралася адмаўляцца ад прынцыпаў расавай тэорыі і ісці на якое-небудзь супрацоўніцтва з народамі Савецкага Саюза.

У той жа час В.Кубэ ў мэтах замацавання акупацыйнага рэжыму лічыў неабходным падтрымаць беларускіх нацыяналістаў, якія ў сваёй большасці зрабілі стаўку на Германію. Арганізацыйнай апорай яго намераў стала БНС – адзіная легальная грамадская арганізацыя, якая сканцэнтравала на той момант асноўныя сілы калабарацыяністаў.

Да пачатку 1942г. было ў асноўным скончана фарміраванне апарата БНС на месцах. Нягледзячы на тое, што па статуту мэтамі БНС з'яўляліся толькі сацыяльная апека і ахова здароўя, па ініцыятыве кіраўніцтва Самапомачы пры падтрымцы гаўляйтэра Кубэ яе палнамоцтвы былі пашыраны. Паступова акрэслілася тэндэнцыя змыкання БНС з адміністратыўным апаратам, членам гэтай арганізацыі сталі даручаць розныя службовыя абавязкі – пачынаючы ад валасных упраў да генеральнага камісарыята ўключна.

Даведаўшыся пра будучы прыезд у Мінск рэйхсміністра акупаваных усходніх абласцей А.Розенберга, кіраўнікі БНС склалі на яго імя спецыяльны даклад, дзе звярталі ўвагу на дыскрымінацыю ў адносінах да беларускага народа. У дакладзе адзначалася, што роль беларусаў у грамадзянскім кіраванні зведзена выключна да пасіўнага выканання распараджэнняў нямецкіх уладаў. Няма беларускай паліцыі, школ з сярэдняй адукацыяй, настаўніцкіх, духоўных семінарый. Не існуе палітычных партый, дапушчана толькі існаванне БНС – арганізацыі са сціплай праграмай матэрыяльнай дапамогі. Словам, з беларусамі абыходзяцца не як з вызваленым, а як з пакораным народам.

Асноўныя высновы даклада звяліся да наступнага:

"Для поўнага выкарыстання беларускіх рэсурсаў трэба зацікавіць усіх беларусаў:

а) вынікам вайны з разгромам руска-яўрэйскага бальшавізма; б) стварэннем новага парадку для беларусаў у Беларусі і яе роллю ў Новай Эўропе пад кіраўніцтвам нямецкага народа".

"Для гэтага неабходна, па меркаванні аўтараў дакументу, актывізаваць беларускі народ, уцягнуўшы яго як зацікаўленага ў непасрэдную барацьбу як на ўнутраным, так і знешнім фронце".[2]

Наўрад ці нараканні беларускіх калабарацыяністаў падзейнічалі на Розенберга, які скептычна адносіўся да беларускага пытання, аднак палітыка адміністрацыі Кубэ з лета 1942г. набыла благапрыемны для іх накірунак. 29 чэрвеня 1942г. Кубэ на ўрачыстым пасяджэнні Беларускай Самапомачы, прысвечаным гадавіне "вызвалення ад бальшавізму", "адгарнуў, – як адзначыў пасля І.Ермачэнка, – новую старонку нашай гісторыі, прызнаўшы БНС сапраўдным прадстаўніком беларускага народа і даўшы яму магчымасць прымаць удзел у кіраванні сваім краем".[3]

Генеральны камісар назначыў І.Ермачэнку сваім дарадчыкам па беларускіх справах. Акрамя таго, ён даў права прапанаваць яшчэ трох чалавек у аддзелы культуры, школ і прапаганды генеральнага камісарыята. Нямецкія акружныя камісары таксама павінны былі мець дарадчыкаў ад БНС. На гэтым жа пасяджэнні В.Кубэ аб'явіў аб намеры стварыць Беларускую Самаахову (БСА).

Галоўным камандантам БСА стаў І.Ермачэнка. У яго абавязак уваходзіла агульнае кіраўніцтва Самааховай і яе матэрыяльнае забеспячэнне за лік БНС. Скліканая Ермачэнкам вайсковая камісія прапанавала праект арганізацыі Беларускага корпуса Самааховы ў складзе трох дывізій. Аднак немцы гэту прапанову не прынялі, дазволіўшы стварыць у кожным раёне ад роты да батальёна БСА.

Магчымасць мець уласныя ўзброеныя сілы здавалася беларускім калабарацыяністам важным крокам на шляху да канчатковай мэты: "ад народнае самабытнасці, шляхам самапомачы і самааховы, да поўнага самаўраду".[4] Яны лічылі, што назначэнне Ермачэнкі дарадчыкам пры генеральным камісары ёсць "фактычна запачаткаваны народны самаўрад", які ў будучым можа ператварыцца ў паўнамочны орган улады.

Як паказалі далейшыя падзеі, гэтыя надзеі аказаліся дарэмнымі. Ідэя аўтаноміі Беларусі не знайшла падтрымкі ў нацысцкага кіраўніцтва. Палітыка Кубэ, спрабаваўшага стварыць беларускі калабарацыянізм апорай супраць партызан і польскага падполля, наткнулася на супраціўленне нямецкіх паліцэйскіх улад. Канфлікт гаўляйтэра Беларусі са службай бяспекі (СД) напрамую сказаўся на лёсе БСА і БНС.

Дзеянні паліцэйскага кіраўніцтва, якое было не супраць выкарыстоўваць Самаахову для барацьбы з партызанамі, тлумачыліся нежаданнем падтрымліваць Ермачэнку і стаяўшага за ім Кубэ, да якога рэйхсфюрэр СС Гімлер адчуваў вялікую непрыхільнасць. Акрамя таго, не ўваходзіла ў іх планы стварэнне ў якой бы та ні было форме беларускай дзяржавы. Нарэшце менавіта гэты палітычны матыў аказаўся рашаючым.

Спачатку адбыліся аргвывады. У канцы ліпеня 1942г. быў адкліканы з Мінска кіраўнік СС і паліцыі Цэнер, які, на думку Гімлера, занадта падтрымліваў Кубэ. Яго прыемнік, В.Шыман, пачаў штучна тармазіць працэс стварэння БСА.

Паколькі акупанты не давяралі беларусам і баяліся ўзбройваць іх фарміраванні, а тым больш даваць ім якія-небудзь палітычныя перспектывы, у процівагу БСА Шыман стаў ствараць беларускія паліцэйскія батальёны пад нямецкім кіраўніцтвам (шутцманшафт). На статус шутцманшафта новы кіраўнік СС і паліцыі стаў пераводзіць атрады Самааховы.

У жніўні 1942г. Ермачэнка быў пазбаўлены пасады Галоўнага каманданта БСА. Хутка немцы распусцілі штаб Самааховы і забаранілі воінскія званні. Замест гэтага Ермачэнку дазволілі мець пры сабе галоўнага рэферэнта па справах БСА і акружных рэферэнтаў на месцах. Па сутнасці, роля беларусаў зводзілася толькі да вярбоўкі ў Самаахову і яе матэрыяльнага забеспячэння. Рэферэнты падпарадкоўваліся як акружным кіраўнікам БНС, так і нямецкім камандантам паліцыі.

Атрады БСА уяўлялі вельмі жаласны від. Асноўная маса салдат насіла звычайную грамадзянскую вопратку, зброю атрымалі нямногія. Не давяраючы беларускім часцям, акупанты імкнуліся ператварыць іх у звычайныя паліцэйскія фарміраванні пад кіраўніцтвам нямецкіх афіцэраў.

Мерапрыемствы паліцэйскіх улад выклікалі рэзкі пратэст беларускіх нацыяналістаў. Асабліва выразна іх незадавальненне вылілася на з'езде БНС у лістападзе 1942г., прысвечаным гадавіне яе стварэння.

Кіраўнікі БНС усё больш уваходзілі ў ролю "прадстаўнікоў народа" і не жадалі быць сляпымі выканаўцамі волі акупантаў. Выступленні дэлегатаў паказваюць рост амбіцый вярхушкі БНС. Так, кіраўнік БНС у Баранавічах Тулейка адзначыў, што ў акрузе 8910 членаў арганізацыі і заявіў, што БНС перарасла рамкі дзейнасці, вызначаныя яе статутам. На заўвагу доктара Вэбера, прадстаўляўшага на з'езде акупацыйныя ўлады, што задачы Самапомачы застануцца ранейшымі, кіраўнік БНС Навагрудскай акругі Рагуля адказаў, што працаўнікі яго акругі "спадзяваліся, што на гэтым з'ездзе БНС вырашыць прынцыпіяльныя пытанні ўсёй Беларусі, аднак ён выклікае ўражанне бацькоўскага сходу ў школе". Кажучы пра БСА, ён заўважыў: "Народ згубіў давер да нас. Няма ніякай магчымасці заставацца няўзброенымі. Мы павінны мець свае ўзброеныя сілы, інакш мы ніколі не адновім давер нашага народа".

Кіраўнік БНС Ермачэнка ў сваім выступленні прызнаў, што "арганізацыя Беларускай Самааховы, па прычынам ад нас не залежачым, злёгку затрымліваецца...". Ён падтрымаў прапанову аб пераглядзе статута і паведаміў дэлегатам, што немцы глядзяць на БНС як на арганізацыю, якая ў будучым "возьме ў свае рукі кіраўніцтва беларускімі справамі".[5]

Праблема БНС абмяркоўвалася ў Берліне ў студзені 1943г. Выступаючы ад СД штурмбанфюрэр СС Гуміч выказаў перасцярогу, " ці не можа доктар Ермачэнка са сваёй БНС выдвінуцца ў народныя правадыры і тады ўяўляць небяспечнасць для нас...".[6] Нягледзячы на тое, што супрацоўнікі грамадзянскай адміністрацыі адзначалі лаяльнасць Ермачэнкі ў адносінах да акупантаў, паліцэйскія ўлады пачалі збіраць кампраметуючы матэрыял супраць яго і самога Кубэ.

У пачатку сакавіка 1943г. адбыўся з'езд БНС, на якім быў выпрацаваны мемарандум аб аўтаноміі Беларусі, стварэнні беларускага ўрада і арміі. У мемарандуме падкрэслівалася, што гэты ўрад "аб'явіць адасабленне Беларусі ад Савецкага Саюза і аб'явіць яму вайну як ворагу беларускага народа, які замахваецца на яго незалежнасць", а "для падтрымкі спакою і парадку ў краі і барацьбы з агульным ворагам – бальшавізмам патрабуе стварыць беларускую нацыянальную армію, забяспечыць яе ўзбраеннем і амуніцыяй, дазволіць сабраць нацыянальныя сілы з-за мяжы Беларусі".[7]

Аднак гэтыя ініцыятывы былі халодна сустрэты паліцэйскім кіраўніцтвам. Следства вакол БНС і Ермачэнкі, інспірыраванае службай бяспекі, завяршылася абвінавачваннем яго ў фінансавых махінацыях. Зыходзячы с гэтага, ён быў выправаджаны з Мінска ў Прагу. Абвінавачванні супраць Ермачэнкі былі зняты ў наступным годзе, што гаворыць аб палітычнай падаплёцы гэтай справы. Сапраўдныя матывы раскрыў летам 1943г. начальнік мінскай СД Штраўх у дакладной запісцы Гімлеру: "... згаданы вышэй Ермачэнка быў паслухмяным інструментам правядзення беларускай палітыкі генеральным камісарам. Ён (Кубэ) даў яму зразумець, што ён мог бы быць беларускім прэм'ерам. Ермачэнка ішоў да гэтай мэты ўсімі існуючымі у яго распараджэнні сродкамі пры падтрымцы гаўляйтэра. Справа магла зайсці вельмі далёка, улічваючы зробленныя намі ў гэтым накірунку памылкі. Лічу дастатковым, калі адзначу, што я цэлы год затраціў на тое, каб загубіць Ермачэнку...".[8]

У маі 1943г. былі скасаваныя рэферэнты БСА, а сама яна распушчана. Меўшыеся фарміраванні Самааховы былі перададзены пад нагляд паліцыі. БНС была перайменавана ў Беларускую Самапомач (БСП). Дзейнасць яе была абмежавана двума першапачатковымі накірункамі: аховай здароўя і матэрыяльнай дапамогаю насельніцтву.

Падводзячы вынік, можна сцвярджаць, што Беларуская Народная Самапомач, урэшцэ, як і іншыя калабарацыяніцкія арганізацыі, не аказала прыметнага ўплыву на становішча ў Беларусі ў перыяд акупацыі. БНС, колькасць якой у лепшыя часы не была вышэй за 20 тысяч чалавек, мела прыхільнікаў сярод інтэлігенцыі, але не мела падтрымкі шырокіх народных мас.

Спробы беларускіх калабарацыяністаў рашыць нацыянальныя задачы з дапамогаю акупантаў, роўна як і адыграць колькі-небудзь самастойную ролю, аказаліся марнымі. Лёс Беларусі вызначаўся вынікам барацьбы Савецкага Саюза і нацысцкай Германіі без удзелу якога-небудзь трэцяга боку.

[1] Менская газэта. 1941. 28 чэрвеня.
[2] НА РБ. Ф.4, воп.33а, спр.203, арк.8–10.
[3] НА РБ. Ф.908, воп.1, спр.4, арк.76.
[4] Беларуская газэта. 1942. 1 жніўня.
[5] НА РБ. Ф.384, воп.1, спр.49, арк.1,10.
[6] Литвин А. Белорусская Краевая Оборона // Неман. 1994, №4, С.180.
[7] НА РБ. Ф.4, воп.33а, спр.203, арк.7.
[8] Литвин А. Белорусская Краевая Оборона // Неман. 1994, №4, С.180.

*Н.А.ГЛУШАКОВА*

## КАНЦЭПЦЫЯ ЭКАНАМІЧНАГА АДРАДЖЭННЯ БЕЛАРУСІ ВА ЎЯЎЛЕННІ БЕЛАРУСКАЙ ПАРТЫІ САЦЫЯЛІСТАЎ-РЭВАЛЮЦЫЯНЕРАЎ (1918–1924)

Вясной 1918 г., пасля абвяшчэння БНР, беларускі нацыянальна-вызваленчы рух уступае ў якасна новую стадыю свайго развіцця. Ідэя нацыянальнага адраджэння Беларусі пераносіцца са сферы абстрактных разважанняў у вобласць практычнай рэалізацыі і накіроўваецца на вырашэнне жыццёва важных праблем эканамічнага і нацыянальна-палітычнага характару. Ідзе пакутлівы пошук беларускага шляху.

У гэты складаны час партыя беларускіх эсэраў[1] прапанавала ўласную праграму нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на Беларусі. Залогам яе поспеху сябры БПС-Р лічылі вырашэнне пытання аб эканамічных асновах развіцця краю. Увогуле, яны адзначалі, што «ахілесавай пятой» беларускага грамадскага руху з'яўляецца адсутнасць абгрунтаванай канцэпцыі эканамічнага адраджэння. Не мелі яе ў той час таксама і самі беларускія сацыялісты-рэвалюцыянеры. Яны пакуль толькі абазначалі асноўныя арыенціры будучага эканамічнага ладу Беларусі.

Улічваючы спецыфіку сацыяльна-эканамічнага развіцця краю і сацыяльнага складу насельніцтва (аграрны край са слаба развітой прамысловасцю), беларускія эсэры вялікую ўвагу надавалі выпрацоўцы перш за ўсё канкрэтнай праграмы рашэння на Беларусі зямельнага пытання. Пры гэтым яны зыходзілі з аграрнай праграмы БСГ і ў асноўным яе паўтарылі.

Аднак нельга сказаць, што гэта было механічнае капіраванне праграмных патрабаванняў свайго палітычнага папярэдніка. Крытычна іх перагледзеўшы, сябры БПС-Р прыйшлі да высновы аб неабходнасці істотнай дапрацоўкі. Так, грамадоўцы прапаноўвалі, каб уся зямля, акрамя лясоў, выганаў і вадзяных абшараў, якія абвяшчаліся агульнакраёвай уласнасцю, перадавалася без выкупу ў карыстанне сялянства. Пасля смерці гаспадара, або з прычыны непрацаздольнасці, атрыманы надзел зямлі пераходзіў у карыстанне бліжэйшых яго супрацоўнікаў. Велічыню надзелу вызначала мясцовая дзяржаўная арганізацыя.

Такая фармулёўка беларускім эсэрам падалася не зусім дакладнай. Патрабавалі далейшага высвятлення, па іх меркаванні, два палажэнні. «Па-першае, якой нормай павінна кіравацца пры ўстанаўленні велічыні надзелу гэтая мясцовая дзяржаўная арганізацыя і, па-другое, якім спосабам індывідуальна-падворная сялянская гаспадарка можа ператварыцца ў калектыўную»[2].

Зыходзячы з гэтага, а таксама ўлічваючы сялянскія наказы, БПС-Р у сваім першым праграмным дакуменце – брашуры «Чаго дамагаецца Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў», выдадзенай у чэрвені 1918 г., прапанавала наступны парадак вырашэння зямельнага пытання.

Прыватная ўласнасць на зямлю адмяняецца. Яна лічыцца агульнанародным скарбам. Ніхто не мае права зямлю прадаваць, купляць і дарыць. Усе будынкі, жывы і мёртвы інвентар застаюцца ва ўласнасці сялян.